Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрымалі актывістаў партыі "Зялёныя" і журналістаў дапоўнена

24.03.2017 **Тэгі**: затрыманні



Затрыманне на офісе партыі па Фабрыцыуса, 4, у Мінску.

Як паведаміла "Наша ніва", усіх, хто быў на офісе партыі па Фабрыцыуса, 4 у Мінску, пагрузілі ў мікрааўтобус і павезлі ў РАУС для высвятлення асобаў і акалічнасцяў.

Сёння, 24 сакавіка, ад 17 да 20 гадзін тут планавалася правесці збор рэчаў, ежы і грошай для затрыманых да і пасля "Маршу недармаедаў" у Мінску і асуджаных на суткі. Запрашалі далучацца ўсіх ахвотных дапамагчы.

Цяпер на офісе нікога няма, але людзі, якія збіраліся падтрымаць акцыю, працягваюць падыходзіць.



Сярод затрыманых былі і журналісты, у тым ліку карэспандэтка Радыё Свабода **Галіна Абакунчык**, журналістка выдання «Новое Время» (Украіна) і журналісты «France24» (Францыя).

Усіх затрыманых, а гэта 13 чалавек, адвезлі ў РУУС Маскоўскага раёна Мінска. Яны ўсе пакуль у аўтобусе каля РУУСа. Паведамляецца, што пачалі адпускаць журналістаў.

Праваабаронцам вядомы наступныя затрыманыя:

- **Галіна Абакунчык**
- **Алесь Залеўскі**
- **Крысціна Бердзінскіх**
- **Хрысціна Чарняўская**
- **Уладзімір Валодзін**
- **Гулівер Крэйн**
- **Ганна Сівакова**
- **Надзея Немік**
- **Павел Патапаў**
- **Аляксандр Малашкаў**
- **Марына Дубіна**

Стала вядома, што аднаго з затрыманых - Уладзіміра Валодзіна - заўтра будуць судзіць у Маскоўскім судзе нібыта за адміністрацыйнае правапарушэнне па арт. 17.1 "Дробнае хуліганства".

Як паведаміла маці Паўла Патапава, пакуль яна знаходзілася пад Маскоўскім РАУСам, у іх кватэры адбыўся агляд у межах адміністрацыйнай справы. Аднак, якой менавіта - пакуль невядома.

Твитнуть









ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY